(1965—67), «Адпомсці, сын» (1968), «Народная вайна» (1969), «Рудабельская рэспубліка» (1970), «На заданне» (1973), «Прарыў» (1975), «Памяць» (1977), дыпціх «Аб вайне і міры» (1978—83), «Нашы прыйшлі» (1984). У творах станковага жывапісу пераважаюць тэмы станаўлення новай вёскі: «Першая камуна ў Беларусі» (1960), «Арганізацыя калгаса ў 1929 годзе», трыпціх «Аб зямлі, аб калектывізацыі» (абедзве 1967). Значнае месца ў творчасці К. займаюць партрэты: «Бабуля» (1956), «Калгасніца» (1960), «Партрэт пастуха» (1965), «Партрэт калгасніка В.Лысага» (1972), «Партрэт лётчыка В.Жогі» (1979), «Н.Карповіч», «Механізатары», «Настаўніца» (усе 1983), пейзажы «Пачатак красавіка» (1962), «Блакітная вясна» (1969), «Зімні дзень» (1975), «Вязынка» (1982), «Вясна на Вячы» (1995), «Бярэзіна» (1996), «Ружы» (1995), «Садавіна» (1996) і інш. Адзін з аўтараў дыярамы «Мінскі кацёл» для Бел. дзярж. музея гісторыі Вял. Айч. вайны (1969—71). *Г.А.Фатыхава.*

**КРАЧКОЎСКІ** Юльян Фаміч (25.7.1840, в. Азяты Жабінкаўскага р-на — 25.7.1903), беларускі фальклярыст, этнограф, гісторык, педагог. Скончыў Духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбуруту (1861). Працаваў у настаўніцкіх семінарыях, інспектарам нар. вучылішчаў. У 1888—1902 старшыня Віленскай археаграфічнай камісіі. Аўтар працы «Нарысы быту заходнярускага селяніна» (1869), у якой падрабязна апісаў бел. радзінны абрад, выхаванне дзяцей, іх працу з маленства. Фалькл.-этнаграф. зб. «Вясельныя абрады заходнярускіх сялян» (1868), «Быт заходнярускага селяніна» (1874) прысвечаны сямейным (пераважна вясельным з усімі этапамі-часткамі) і каляндарна-аграрным абрадам і святам. Складальнік 16-га і 20-га тамоў, аўтар прадмоў да іх і да 25-га тома «Актаў Віленскай камісіі». Пад рэдакцыяй К. і з яго прадмовамі выйшлі 12—13-я тамы «Археаграфічнага зборніка дакументаў» (1900—02).

**КРАЧЭЎСКІ** (К р э ч э ў с к і) Пётр Антонавіч (7.8.1879, Кобрынскі павет Гродзенскай губ. — 8.3.1928), беларускі палітычны дзеяч, паэт, драматург, гісторык. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1902). З 1902 настаўнічаў у Беластоцкім і Ваўкавыскім паветах, з 1909 працаваў у Віленскім дзярж. банку. З 1914 на вайсковай службе. Пасля Лют. рэв. 1917 старшыня Барысаўскага Савета салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Дэлегат Усебел. з'езда 1917. У 1918 у складзе Нар. сакратарыята Беларусі, выконваў абавязкі дзярж. кантралёра, нар. сакратара фінансаў, нар. сакратара гандлю і прам-сці. Узначальваў Цэнтр. бел. гандлёвую палату. Адзін з лідараў Бел. партыі сацыялістаў-федэралістаў. З 13.12.1919 старшыня Рады Бел. Нар. Рэспублікі. З 1920 у эміграцыі ў Літве, Чэхаславакіі. Выступаў у абарону інтарэсаў Беларусі на міжнар. арэне, асуджаў Рыжскі мірны дагавор 1921, рашэнні 2-й Усебел. канферэнцыі (Берлін, 1925). Аўтар вершаванай драмы «Рагнеда» (1921), вершаў, перакладаў з чэшскай і ўкр. моў, рэд. зб-ка па гісторыі, культуры і эканоміцы Беларусі «Замежная Беларусь» (Прага, 1926).



*Ю.І.Крашэўскі.*

**КРАШЭЎСКІ** (Kraszewski) Юзаф Ігнацы (28.7.1812, Варшава — 19.3.1887), польскі пісьменнік, гісторык, грамадскі дзеяч. Акадэмік Акадэміі ведаў у Кракаве (1872). У дзяцінстве жыў у в. Доўгае каля г. Пружаны. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, Віленскім ун-це. У 1841—51 рэдагаваў віленскі час. «Athenaeum» («Атэнэум»), з 1880 — «Gazeta Polska» («Польская газета»). Стваральнік новага рэаліст. гіст. рамана ў польск. л-ры: «Апошнія з слуцкіх князёў» (1841), «Зыгмунтаўскія часы» (1846), «Залаты яблык» (1853), «Графіня Косель» (1873), «Старая казка» (1876), «Кароль у Нясвіжы, 1784» (1885) і інш. Раманы і аповесці К. «Гісторыя Саўкі» (1842), «Ульяна» (1843), «Астап Бандарчук» (1847), «Хата за вёскай» (1853—54), «Ярмола» (1857), «Гісторыя калка ў плоце» (1860), «На Палессі» (1884) і інш. пра цяжкую долю ўкр. і бел. прыгоннага сялянства. Аўтар навук. гіст. прац: «Старажытная Літва. Яе гісторыя, законы, мова, вера, звычаі, песні...» (1847—50), «Барысаў» (1848), «Мастацтва ў славян, асабліва ў Польшчы і добрахрысціянскай Літве» (1860), нарысаў краязнаўчых і аб уласных падарожжах «Пінск і Піншчына» (1838), «Успаміны Палесся, Валыні і Літвы» (1840), «Малюнкі з жыцця і падарожжаў» (1842), «Адзенне мяшчан і сялян з ваколіц Брэста, Кобрына і Пружан» (1860). Вершы К. «Дзед і баба», «Ці ты не знаеш старонку?» на бел. мову пераклаў Я.Купала. *А.М.Ненадавец.*

**КРАЯЗНАЎСТВА**, грамадскі рух і комплексная навук. дысцыпліна, аб'ектам пазнання якіх з'яўляюцца асобныя рэгіёны, населеныя пункты ў межах краіны. К. як грамадскі рух ахоплівае прадстаўнікоў мясц. насельніцтва, якія аб'ядноўваюцца ў т-вы, гурткі і інш. аматарскія аб'яднанні, і асобных краязнаўцаў-аматараў. К. як навук. дысцыпліна даследуе гісторыю, прыроду, эканоміку, сац. сферу, культуру асобных тэр. Комплекснае К. разглядае ўсе звесткі ва ўзаемасувязі. Галіновае К. паглыблена вывучае асобныя кірункі: гіст., геагр., этнаграф., літ., тапанімічны, рэліг. і інш.

Структураванне К. як грамадскай з'явы не мае агульнапрызнаных падыходаў. Вылучаюць паводле інстытуцыянальнай прыкметы К. школьнае, музейнае, архіўнае, бібліятэчнае, турыстычнае, К. ў ВНУ, паводле рэалізацыі грамадскіх задач — навук.,

вытворчае, пазнавальнае (у дапамогу адукацыі і самаадукацыі), асветніцкае, камерцыйнае, паводле форм рэалізацыі краязнаўчых задач — дзярж. і грамадскае, школьнае. Сучаснае К. набыло выразны сац. характар; традыцыйна выконвае выхаваўчыя (патрыятычнае, грамадзянскае, маральнае выхаванне асобы, падмурак нац. свядомасці), рэкрэацыйныя, асветніцкія функцыі; актыўна садзейнічае выкарыстанню здабыткаў культ. спадчыны як рэсурсу сац.-эканам. развіцця, росту іміджу і інвестыцыйнай прывабнасці рэгіёнаў.

К. ў Беларусі мае глыбокія гіст. карані, узыходзіць да фіксавання звестак пра бел. землі ў летапісах і хроніках, падарожных запісках, у вуснай фалькл. спадчыне. У 16—18 ст. ішло ўзнікненне навук. К. (прыродазнаўчага: Ж.Э.Жылібер, С.Б.Юндзіл і гіст.: А.Гваньіні, М.Стрыйкоўскі і інш.). Уздым К. ў Беларусі назіраецца з пач. 19 ст., асабліва грамадскага. Выдатным фактам згуртавання аматараў К. для навук. і асветніцкай дзейнасці было стварэнне *Віленскага музея старажытнасцей* і археал. камісіі пры ім па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам Я.П.Тышкевіча. У навук. даследаванне і апісанне бел. мясцовасцей значны ўклад ўнеслі З.Я.Даленга-Хадакоўскі, Т.Нарбут, Ю.Нямцэвіч, Я.Баршчэўскі, А.Кіркор, Ю.Крашэўскі, А.Плятэр, К.П. і Я.П. Тышкевічы, У.Сыракомля, П.М.Шпілеўскі і інш.

У апошняй чвэрці 19 — пач. 20 ст. ўзніклі новыя краязнаўчыя аматарскія арг-цыі (Віцебская губ. вучоная архіўная камісія, Т-ва па вывучэнні Бел. краю і інш.), выразны краязнаўчы кірунак праявіўся ў дзейнасці губернскіх статыстычных к-таў. Плённа займаліся краязнаўчай працай М.Я.Нікіфароўскі, А.К.Ельскі, П.В.Шэйн, Е.Р.Раманаў, А.М.Семянтоўскі, А.П.Сапуноў, Э.Гутэн-Чапскі, М.Ф.Кусцінскі, Я.Ф.Карскі, В.А.Шукевіч і інш.

У 1920-я гг. ў БССР К. атрымала дзярж. падтрымку, набыло масавасць і развітую арганізацыйную структуру, было прызнана масавым навук.-культ. рухам і мела цесныя сувязі з навук. цэнтрамі. Цэнтр. бюро краязнаўства (ЦБК) дзейнічала пры Ін-це бел. культуры (1923), потым пры Бел. АН (1929—36), у 1925—30 выдавала час. «Наш край». У бюро працавалі А.І.Смоліч, С.В.Скандракоў, М.В.Азбукін, К.Крапіва, В.І.Пераход, У.І.Пічэта, Р.К.Шукевіч-Трацякоў і інш. У сярэдзіне 1920-х гг. склаліся 3 тыпы краязнаўчых арг-цый: 1) акружныя краязнаўчыя т-вы, 2) раённыя краязнаўчыя т-вы, 3) гурткі. Задачы К. вызначаліся на Усебел. з'ездах (1926, 1927) і канферэнцыях (1924, 1929, 1930). У 1929 дзейнічала 301 краязнаўчая арг-цыя з 10 510 чл. Краязнаўцы зрабілі значны ўклад у збор моўнага, этнаграф., фалькл. матэрыялу, прыродазнаўчае, санітарна-гігіенічнае вывучэнне шэрагу тэр. БССР. Выдатныя дзеячы К. гэтага перыяду: З.Бядуля, Д.М.Васілеўскі, М.І.Каспяровіч, Д.І.Даўгяла, В.Д.Дружчыц, З.К.Магілёўчык, М.М.Улашчык, А.А.Шлюбскі, С.С.Шутаў, М.М.Шчакаціхін і інш. У пач. 1930-х гг. перад краязнаўчым рухам пачалі ставіцца не ўласцівыя К. задачы і з'явіліся беспадстаўныя паліт. абвінавачанні, што прывяло да спынення краязнаўчай дзейнасці ў 2-й пал. 1930-х гг. і рэпрэсій супраць многіх краязнаўцаў.

На тэр. Зах. Беларусі ў 1920—30-я гг. арганізоўваліся рэгіянальныя аддз. Польск. краязнаўчага т-ва. Вывучэннем зах.-бел. краю займаліся Я.Булгак, А.І.Луцкевіч, Я.Н.Драздовіч, Р.Гарашкевіч, Ч.Пяткевіч, І.І.Стаброўскі, Ю.Ядкоўскі і інш. У Вільні былі створаны Бел. музей імя І.Луцкевіча, Бел. навук. т-ва, Бел. ін-т гаспадаркі і культуры, у Гродне і Пінску дзейнічалі мясц. краязнаўчыя аб'яднанні.

У пасляваен. перыяд узрасла роля К. ў выхаваўчай рабоце, патрыятычнай рабоце сярод школьнікаў і моладзі. Пачалі праводзіцца турыстычна-краязнаўчыя экспедыцыі школьнікаў, ствараліся школьныя музеі, шырока ажыццяўлялася пошукавая і збіральніцкая дзейнасць. Актыўна працавалі студэнцкія краязнаўчыя арг-цыі ў ВНУ (Гродзенскі пед. ін-т, Мінскі пед. ін-т імя А.М.Горкага, БДУ і інш.) Хутка пашыралася сетка краязнаўчых музеяў. У б-ках вызначыўся самаст. кірунак краязнаўчай дзейнасці, з'явіліся спецыялізаваныя структурныя падраздзяленні, назапашваліся краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы. Значны ўклад у развіццё К. зрабілі *Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры*, Бел. т-ва аховы прыроды і інш. У 1989 створана *Беларускае краязнаўчае таварыства* (БКТ), фарміраваліся яго абл. і раённыя рэгіянальныя структуры.

У сучасным краязнаўчым руху ўдзельнічаюць суб'екты розных інстытуцыянальных форм К. Грамадскае К. прадстаўлена шматлікімі краязнаўчымі арг-цыямі, якія самастойна вызначаюць задачы, кірункі і формы дзейнасці. Сярод іх «Віцебскі краязнаўчы фонд імя А.П.Сапунова», «Талака» (Гомель), Заходнепалескае навук.-краязнаўчае т-ва «Загароддзе», Браслаўскае краязнаўчае т-ва імя О.Гедэмана, краязнаўчае т-ва імя К.Тызенгаўза (г. Паставы), Тураўскае навук.-асветнае т-ва і інш. Сярод рэсп. грамадскіх арг-цый плённа працуюць ў краязнаўчым кірунку Бел. фонд культуры і Т-ва бел. мовы імя Ф.Скарыны.

Школьнае К. каардынуецца Мінвам адукацыі і Рэсп. цэнтрам турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі і адпаведнымі ўстановамі ў абласцях і раёнах. У школах праводзяцца этапы Усебел. турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» (раней «Наш край»), працуюць краязнаўчыя музеі (больш за 1400), вядзецца пошукава-даследчая работа, выкладаюцца краязнаўчыя факультатыўныя дысцыпліны («Оршазнаўства» і інш.).

Музейнае К. лідзіруе ў кірунках навук. і асветніцкай дзейнасці. З'яві-

ліся дзярж. музеі гісторыі гарадоў Магілёва і Мінска. Музеі публікуюць зб-кі навук. арт. («Краязнаўчыя запіскі» Гродзенскага гіст.-археал. музея, «Магілёўшчына» Магілёўскага абл. музея імя Е.Р.Раманава і інш.).

ВНУ уносяць важкі ўклад у вучэбна-метадычнае забеспячэнне дысцыплін комплексу К., рыхтуюць кадры ў галіне геагр., гіст., літ., моўнага, музейнага, бібліятэчнага кірункаў К.

У бібліятэчным К. ідзе рэалізацыя буйных навук. праектаў па ўзнаўленні ў лічбавай форме каштоўных крыніц краязнаўчай інфармацыі мінулага: губернскіх памятных кніжак Беларусі (Нац. б-ка Беларусі); віртуальнай рэканструкцыі творчай спадчыны выдатных землякоў; фарміруюцца бібліяграфічныя, камбініраваныя, паўнатэкставыя краязнаўчыя базы даных і інш.

Суб'екты краязнаўчага руху імкнуцца да ўзаемадзеяння і абмену дасягненнямі. Выдатная роля ў гэтай справе належыць *«Краязнаўчай газеце»*. Адметнай з'явай сучаснасці сталі краязнаўчыя канферэнцыі і чытанні, якія праводзяцца на міжнар., рэсп. і рэгіянальным узроўнях у многіх раённых, абл. цэнтрах. Традыц. сталі Браслаўскія, Гродзенскія, Карэліцкія, Каладзееўскія (г. Барысаў), Лепельскія, Лунінецкія, Магілёўскія, Шацілкаўскія (г. Светлагорск) і многія інш. чытанні і канферэнцыі. Рэгулярна праводзяцца абл. і рэсп. пед. краязнаўчыя чытанні.

Суб'екты К. актыўна распаўсюджваюць фіксаваныя краязнаўчыя веды праз друк, СМІ, Інтэрнэт. Вынікам дзейнасці мясц. краязнаўцаў і спецыялістаў навук. устаноў было завяршэнне ў 2005 выпуску ўнікальнага шматтомнага выдання гіст.-дакум. хронік «Памяць». Знакавай падзеяй стаў выхад «Хронікі Убарцкага Палесся» А.А.Атнагулава. Шмат матэрыялаў друкуецца ў выданнях краязнаўчага характару «Лідскі летапісец» (з 1997), «Куфэрак Віленшчыны» (з 2000), «Лунінецкі сшытак» (з 2002) і інш. Дакум. фільмы і праграмы на каналах тэлебачання папулярызуюць краязнаўчыя веды: «Падарожжы дылетанта» («Прыгоды дылетанта»), «Наперад у мінулае» і інш.

Дасягненні сучаснага краязнаўчага руху звязаны з імёнамі адданых гэтай справе вучоных, спецыялістаў і аматараў, у іх ліку А.Р.Бензярук, А.І.Бутэвіч, А.І.Валахановіч, У.А. Гілеп, І.В.Грабянчук, А.П.Грыцкевіч, У.М.Дзянісаў, В.А.Ермалёнак, А.М. Карлюкевіч, Г.А.Каханоўскі, А.В. Кузьміч, А.С.Кузьміч, В.М.Лебедзева, М.М.Маліноўскі, А.І.Мальдзіс, І.А.Марзалюк, Л.М.Несцярчук, А.М. Падліпскі, М.В.Півавар, І.А.Пушкін, В.П.Рагойша, В.У.Скалабан, І.Г.Трусаў, К.С.Шыдлоўскі і інш.

*Літ.*: Каханоўскі Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI—XIX стст. Мінск, 1984; Алексеев Л.В. Археология и краеведение Беларуси, XVI в. — 30-е годы XX в. Минск, 1996; Краязнаўчы рух // Памяць, Мінск: гіст.-дакум. хроніка. Кн. 3. Мінск, 2004.

*В.І.Саітава.*

**«КРАЯЗНАЎЧАЯ ГАЗЕ́ТА».** Выдаецца з крас. 2003 у Мінску на бел. мове штотыднёва. Заснавальнікі — грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», У.А.Гілеп. Публікуе «Малую краязнаўчую энцыклапедыю», даследаванні па гісторыі краязнаўчага руху, навук.-папулярныя артыкулы па археалогіі, тапаніміцы, этнаграфіі, фальклоры, радаводах, гіст.-літ. эсэ пра Беларусь і інш. Інфармуе пра новую краязнаўчую л-ру, у т.л. рэгіянальную. Асвятляе пытанні нац. гісторыі і культуры, архіўнай, музейнай і бібліятэчнай справы, друкуе нарысы пра навук. спадчыну Ф.Скарыны, Я.Купалы, Я.Коласа, І.Насовіча, В.Ластоўскага, У.Сыракомлі, Г.Каханоўскага і інш. Сярод рубрык: «Асоба ў краязнаўстве», «Наша гісторыя: ідэі, падзеі, імёны», «Музей галіны», «Школьнае краязнаўства», «Царкоўнае краязнаўства», «Спадчына ў небяспецы», «Рэгіён» і інш. *У.А.Гілеп.*

**КРОЗ** Дора Захараўна (12.11.1909, г. Сянно — 8.12.1997), беларуская артыстка оперы (лірыка-каларатурнае сапрана). Скончыла Бел. кансерваторыю (1937, клас В.Несцярэнка). У 1933—49 салістка Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі. Валодала голасам прыгожага мяккага тэмбру, тонкім муз. густам. Стварыла запамінальныя вобразы ў операх класічнага рэпертуару: Мікаэла («Кармэн» Ж.Бізэ), Марфа («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Джыльда, Віялета («Рыгалета», «Травіята» Дж.Вердзі). Сярод інш. оперных партый — Марфачка («Алеся» Я.Цікоцкага), Караліна («У пушчах Палесся» А.Багатырова), Русалка («Кветка шчасця» А.Туранкова).

**КРОЛЬ** Абрам Іосіфавіч (18.4.1913, г. Дзяржынск — 3.2.1990), беларускі жывапісец. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1932). Працаваў у станко-



*А.Кроль. Шэрань. 1960.*